жф 3235

Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

# Калгасная газета

Орган Мсціслаўскага РК КП(б)Б і Выканкома Райсовета Дэпутатаў Працоўных

№ 5
НЯДЗЕЛЯ
7
лістапада
1943 г.

Библиотека АН БССР

## НЯХАЙ ЖЫВЕ 26 ГАДАВІНА ВЯЛІКАЙ КАСТРЫЧНІЦКАЙ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭВОЛЮЦЫІ

## XXVI год пад сцягам партыі Леніна-Сталіна

Сёння 7 лістапада, дзень 26-ай гадавіны Вялікай Окцябрскай Соцыялістычнай Рэволюцыі. Народы нашай краіны разам з працоўнымі ўсяго свету адзначаюць гэты дзень у разгары жорсткай барацьбы за поўны разгром і знішчэнне нямецка-фашысцкіх захватчыкаў і іх прыспешнікаў.

26-ую гадавіну Окцябра мы святкуем ва ўмовах Айчыннай вайны. Больш двух год прайшло з таго дня калі гітлераўская Германія подла і вераломна напала на нашу краіну, каб парабаціць яе, знішчыць нашу культуру і народ. Велізарнейшую вытрымку і цвёрдасць, мужнасць і самаадданасць праявілі народы нашай краіны адстайваючы чэсць, свабоду і незалежнасць сваёй Радзімы.

Пад кіраўніцтвам Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршала Совецкага Саюза таварыша Сталіна праслаўленыя совецкія воіны, байцы, камандзіры і палітработнікі Чырвонай Арміі, не шкадуючы сваіх сіл і самога жыцця ва імя радзімы зламалі супраціўленне каварнага ворага і няспынна гоняць яго на захад.



„Наступленне Чырвонай Арміі прадаўжаецца ў бягучым годзе восем месяцаў. Ні адна армія ў ходзе сучаснай вайны не вяла наступацельных аперацыый такі доўгі час. У 1941 годзе немцы з свежымі сіламі наступалі 5 месяцаў. У 1942 годзе—3 м-цы. У 1943 годзе—10 дзён.

Наступленне Чырвонай Арміі развіваецца на велізарным фронце працяжнасцю многа больш тысячы кілометраў“.

Гэтыя лічбы яскрава гавораць аб вялікіх зменах суадносін ваюючых краін у ходзе вайны, нарастанне магутнасці Чырвонай Арміі і прагрэсіруючае падзенне наступальнай здольнасці нямецкай арміі, а таксама істашчэнне яе рэзерваў.

Адступаючы вораг, як падыхаючы крыважадны звер знішчае ўсё з зямлі створанае вякамі чалавекам.

Толькі ў нашым раёне за 26 месяцаў зверскі замучана і растраляна 2428 чалавек. Увезена ў рабства ў Германію 1234 чалавека. Спалена жыллёвых дамоў 3552 і грамадска-калгасных будынкаў 1304.

Вораг хацеў наш народ ператварыць у рабоў, а краіну ў сваю калонію. Але ён пралічыўся, смерць фашызма не мінуча. Яго адборныя корпусы і дывізіі разбіты нашай гераічнай Чырвонай Арміяй пад Масквою, Сталінградам, Ленінградам, Севастопалем і на іншых участках фронта.

Нашай задачай з'яўляецца ўсімі сіламі і сродкамі, самаадданай працай дапамагаць Чырвонай Арміі ў канчатковым разгроме ненавіснага ворага.

Няхай жыве перамога англа-совецка-амерыканскага баявога саюза над злейшымі ворагамі чалавецтва — нямецка-фашысцкімі парабашчыцелямі!

Няхай жыве Чырвоная Армія!

Няхай жыве мудрая партыя Леніна—Сталіна!

Няхай жыве родны, любімы таварыш Сталін!

## АД СОВЕЦКАГА ІНФОРМБЮРО

(З аператыўнай зводкі за 4 лістапада 1943 года).

На працягу 4 лістапада ў раёне паміж р. Днепр і пабярэжжам Каркініцкага заліва нашы войскі прадаўжалі развіваць наступленне і з баямі аўладалі раённымі цэнтрамі Нікалаеўскай вобласці горадам Цюрупінск (Алёшкі), гор. Голая Прыстань, а таксама занялі больш 30 іншых населёных пунктаў.

У ізлучыне Днепра паўднёва-заходней Днепрапятроўска нашы войскі, перамагаючы супраціўленне праціўніка, занялі некалькі населёных пунктаў.

Паўночней Кіева нашы войскі вялі бой па расшырэнню плацдарма на правам беразе Днепра і пасля жорсткіх баёў аўладалі раённым цэнтрам Кіеўскай вобл. Дымер і моцна ўкрапленымі апорнымі пунк-

(Працяг на 2-ой старонцы)

(Працяг зводкі)

фамі праціўніка Мануільск, Федараўка, Глебаўка, Казаровічы, Гоянка, Дачы, Пушча, Водзіца.

У раёне заходней і паўднёва-заходней Невеля нашы войскі вялі баі мясцовага значэння ў выніку якіх занялі больш 70 насялённых пунктаў.

3 лістапада падбіта і знішчана 81 нямецкіх танкаў, збіта 40 самалётаў праціўніка.

**
*

(За 5 лістапада 1943 года).

На працягу 5 лістапада паміж Дняпроўскім ліманам і пабярэжжам Чорнага мора нашы войскі прадаўжалі наступленне і занялі больш 30 насялённых пунктаў.

У ізлучане Дняпра і паўднёва-заходней Днепрапятроўска нашы войскі адбівалі контратакі праціўніка вялі баі мясцовага значэння.

У раёне Кіева вялі баі за пашырэнне плацдармаў на правым беразе р. Дняпра, у ходзе баёў нашы войскі прасунуліся ўперад і занялі надта ўмацаваныя пункты: Гаўрылаўка, Барсукаўка, Літвінаўка, Масціўшча, Святошына, Верхавец і перарэзалі шасэ Кіеў—Жытомір.

Заходней і паўднёва-заходней Невеля, нашы войскі вялі баі мясцовага значэння і занялі некалькі насялённых пунктаў.

На працягу 4 лістапада на ўсіх франтах падбіта і знішчана 49 танкаў, у паветраных баях збіта 23 самалёты праціўніка.

У Балтыйскім моры патоплен транспарт вадазмяшчэннем у 5 тыс. тон, старажавы карабаль, буксір праціўніка.

## Дзеці звярнуліся ў совецкія школы

Два гады нашы дзеці былі адарваны ад свайго шчаслівага дзіцячага жыцця — савецкай школы. Зараз кожную раніцу мы сустракаем весёлую дзетвару бягучую ў школу, як у свой родны бацькоўскі дом. Няма больш смутку на тварах дзяцей, страху за заўтра, за жыццё.

У раёне адчынена і працуе 1 сярэдняя школа, 10 НСШ і 57 пачатковых школ у якіх навучаецца 9612 вучняў.

Калагалава П.

## З НАРАДЫ СТАРШЫНЬ КАЛГАСАЎ

Днямі адбылася нарада старшынь калгасаў Мсціслаўльскага раёна, на якой выступіў сакратар ЦК КП(б)Б таварыш Малін.

У сваёй глыбока палітычнай прамове тав. Малін застанавіўся на Айчыннай вайне, вераломным нападзе фашысцкай Германіі на Совецкі Саюз.

Тав. Малін асабліва застанавіўся на высокім патрыятызме совецкага народа, праяўленым у абароне Масквы, Ленінграда, Сталінграда і Севастопаля, адзінстве тыла і фронта. Гераічным прадзвіжэнні Чырвонай Арміі ўперад і правале гітлераўскіх планаў маланкаснай вайны і татальнай мабілізацыі.

Нашымі першачарговымі задачамі,—гаворыць тав. Малін,—з'яўляецца адбудаванне разбуранай гаспадаркі раёна.

На гэтай-жа нарадзе выступіў генерал-маёр, старшыня Магілёўскага Аблвыканкома таварыш Кардовіч. У сваёй прамове тав. Кардовіч падрабязна застанавіўся на канкрэтных задачах адбудавання калгасаў, соўгасаў, МТС і прадпрыемстваў.

З вялікай радасцю нарада паслала пісьмо таварышу Сталіну, шчырай падзякі за вызваленне нашага раёна ад фашысцкіх акупантаў.

М. К.

## ПІСЬМО З ФРОНТА

Дарагія таварышы! Пасылаю Вам сваё баявое прывітанне з фронта Айчыннай вайны. З вялікай радасцю я прачытаў у газеце, што мой родны горад Мсціслаўль, у якім я нарадзіўся і вырас вызвален ад фашысцкіх сабак.

Зараз, таварышы, прызываю Вас хутчэй адбудаваць разбураны горад і запэўніваю ў тым, што наша доблесная Чырвоная Армія ў хуткім часе разгроміць ненавіснага ворага і зноў будзем жыць спакойна і шчасліва.

Ваш зямляк, афіцэр
Г. С Жыватковіч.

## З чым мы прышлі да 26 гадавіны Кастрычніка

Прайшло 5 тыдняў з дня вызвалення нашага раёна ад нямецкіх разбойнікаў.

Дзякуючы вялікаму ўздыму творчага энтузіязма партыйна-совецкіх устаноў і працоўных раёна за гэты час поўнасцю адноўлена 157 калгасаў. Звернута ў калгасы 2540 коней нарыхтавана 5900 цэнт. фуражу. Толькі па 6 сельсоветам сабрана 1070 плугоў, 1209 барон, 1017 калёс. Засыпаецца насенне для вяснавога севу 1944 г.

Арганізаваны і працуюць промарцелі: шавецкая, сталярная, кравецкая, слясарная, кузнечная, якія абслугоўваюць патрэбы Чырвонай Арміі і насельніцтва раёна. Бялоў.

**
*

З вялікім энтузіязмам працуюць трактарысты Ходасаўскай МТС пад кіраўніцтвам механіка Ігнатава. На развалінах будынка майстэрні трактарысты поўнасцю адрамантавалі адзін трактар, 3 плугі, падрыхтавалі запасных частак на 2 трактары, 4 плугі, 5 дыскавых барон, поўнасцю абсталявалі кузніцу. Васільеў.

## Нашым вызваліцелям

Больш месяца як мы жывём свабодна і шчасліва, адбудоўваем сваю разбураную ворагам гаспадарку раёна. Ходзім па сваёй совецкай зямлі вольна, смела і ўпэўнена за будучае, за намі ніхто не сочыць з тым каб схваціць і адправіць у Германію на рабства або зусім растраляць.

За гэта ўсё мы ўдзячны нашай любімай Чырвонай Арміі.

,,Прыміце родныя ад нас нашы скромныя падарункі, ежце на здароўе, выздараўлівайце хутчэй і дабівайце ворага без астатку. Біце іх за загубленых сыноў, братоў, матярэй і дзяцей".—Так пішуць працоўныя раёна ў сваіх карсткіх пісьмах, перадаючы падарункі для раненых.

Толькі за два дні здадзена 203 курэй, 3718 яек, 118 кілаграмаў сала і мяса, насокў і вязёнак 65 пар і інш. Штодзённа паступае 800 літраў малака для раненых байцоў. Ш. Н.

Адказны рэдактар
М. Г. Карнейчык.